www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
23/11-30/11/07

**АФІЦЫЙНА**
▪Трэці камітэт ААН прыняў рэзалюцыю аб правах чалавека ў Беларусі

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Кангрэс праэўрапейскіх сілаў Беларусі

**ГРАМАДЗТВА**
▪Угодкі Слуцкага збройнага чыну
▪Каля Барысава перазахавалі 223 француцкія жаўнеры

**ПАЛІТЫКА**
▪Візыт Аляксандра Мілінкевіча ў Рыгу

**ЭКАНОМІКА**
▪Рост коштаў на малако й мяса

**КУЛЬТУРА**
▪Выстава твораў Напалеона Орды ў Менску

X Менскі форум, які прайшоў 22-24 лістапада, мяркуючы па ўдзеле ў ім шматлікіх прадстаўнікоў ЭЗ, Нямеччыны і беларускага рэжыму, абяцаў стаць новым, заўважным імпульсам у нармалізацыі адносінаў Беларусі з аб'яднанай Эўропай. У выступах заходніх гасьцей форуму асаблівая ўвага надавалася Беларусі менавіта як краіне, праз якую ажыцьцяўляецца транзыт энэргарэсурсаў і тавараў. Пры гэтым пастаянна гучала запэўніваньне, што Брусэль не намераны «ізаляваць» Беларусь і гатовы да дыялёгу, які грунтаваўся бы на 12 вядомых умовах па вызваленьні палітзьняволеных, забесьпячэньні правоў і свабодаў чалавека, свабоды слова і СМІ, правядзеньні празрыстых і сумленных выбараў.

Варта зазначыць, што транзытнае значэньне Беларусі палягае ў прапампоўваньні 20% пастаўлянага ў Эўропу расейскага газу (80% ідуць праз Украіну) і каля 45-50 млн. тонаў нафты. Пры гэтым Бэрлін сьцьвярджае, што закрывае расейскай нафтай толькі 30% патрэбы краіны ў чорным золаце.

На думку шэрагу экспэртаў, прызнакі дыялёгу зь беларускім рэжымам будуць праяўляцца ў рознай ступені да таго часу, пакуль у Нямеччыны ды іншых краінаў ЭЗ ня зьявіцца альтэрнатыўны маршрут паставак расейскіх энэргарэсурсаў (праект «Паўночная плынь»).

Прэзыдэнцкія мэдыі надалі незвычайна вялікую ўвагу Менскаму форуму, даўшы магчымасьць некаторым заходнім экспэртам выступіць, напрыклад, по тэлебачаньні. Доступ да дзяржаўных і замежных СМІ атрымалі і высокапастаўленыя беларускія чыноўнікі-ўдзельнікі форуму. Афіцыйная прапаганда рабіла ўсё, каб стварыць уражаньне пра пачатак сур'ёзнага дыялёгу з Эўропай, асновай якога павінна быць энэргабясьпека, а ня "нейкія" правы чалавека.

Здавалася б, праявай такога дыялёгу павінны былі служыць і размовы, якія праходзілі ў дні форуму ў МІД Беларусі з галоўным дарадчыкам Хаўера Саляны Хельгай Шміт і дырэктарам Дэпартамэнту кантынэнтальнай Эўропы Францыі Жакам Форам. Аднак ізноў мелі рацыю тыя, хто проста ня верыць у здольнасьці кіраўніка Беларусі весьці дыялёг і вярнуць краіну ў Эўропу.

«Эўропа сёньня ня хоча нармалізацыі адносінаў зь Беларусьсю. Таму што ў свой час занадта далёка зайшла, а сёньня трэба, захаваўшы твар, з гэтага выйсьці», – заявіў Лукашэнка ў інтэрвію гішпанскай газэце "Эль Паіс".

«Хопіць рашучасьці ў Эўрапейскага Зьвязу гэта зрабіць, мы будзем сядзець за адным сталом, весьці дыялёг, калі мы хочам быць бліжэй. Мы гэтага хочам і паўсюль пра гэта гаворым», – падкрэсьліў Лукашэнка. «А Эўрапейскі Зьвяз ня хоча, і ён высоўвае нам непрымальныя ўмовы. Навошта ўмовамі абазначаць наш дыялёг? Ня трэба», – падсумаваў Лукашэнка.

Такая рэакцыя Лукашэнкі зьявілася буквальна праз два дні пасьля заяваў афіцыйных асобаў ЭЗ пра імкненьні Беларусі да дыялёгу. Варта зьвярнуць увагу і на наступны факт.

Як вядома, кіраўнік новага ўраду Польшчы Дональд Туск зрабіў шэраг заяваў, у якіх выказаў жаданьне палепшыць адносіны з Расеяй і Беларусьсю. На жаль, пасьля дадзенай заявы зноўку праявілася схільнасьць беларускага рэжыму да самаізаляцыі. Прыкладам гэтага можа служыць выпадак у Гомелі. За ўдзел у сэмінары беларускіх праваабаронцаў, які праводзіўся ў прыватнай кватэры, зь Беларусі былі вытураныя некалькі польскіх грамадзянаў. У іх проста анулявалі візы. Можна ўзгадаць, што яшчэ да свайго прэм’ерства Дональд Туск таксама быў абвешчаны беларускімі ўладамі пэрсонай нон грата. Такія прыклады ня могуць даваць нагодаў для аптымізму ў адносінах паміж Варшавай і Менскам. Тым ня менш, па словах дэпутата Эўрапарляманту Януша Анышкевіча, у адносінах да Беларусі палітыка цяперашняга ўраду Польшчы будзе «больш разумнай». І, канешне, не на шкоду агульнапрынятым дэмакратычным стандартам і эўрапейскім каштоўнасьцям.

На тле пэўнага ажыўленьня кантактаў афіцыйнага Менску з Эўропай на розных узроўнях, апошнія весткі з Масквы зноўку выклікаюць трывогу ў спажыўцоў расейскага газу. «Газпрам» папярэджвае, што эўрапейскія спажыўцы павінны быць гатовы да таго, што ў сувязі з ростам цэнаў на нафту ў наступным годзе тарыфы на газ вырастуць на 17%, дасягнуўшы новых рэкордных адзнак у 300-350 даляраў за тысячу кубамэтраў.

Абвешчана пра тое, што дасягнута пагадненьне з Туркмэніяй пра рэзкае павышэньне цэнаў. Расейская дзяржаўная кампанія ў першай палове будучага году будзе плаціць 130 даляраў за тысячу кубамэтраў, а ў другой – 150 даляраў супроць 100 даляраў у гэтым годзе. Са студзеня 2009 году "Газпрам" пяройдзе на формулу цаны, "заснаваную на рынкавых прынцыпах". Для Беларусі гэтыя «прынцыпы» могуць выліцца ў лічбу ад 150 да 200 даляраў. Як мяркуюць незалежныя эканамісты, такая пэрспэктыва ўжо выклікала ўзмацненьне росту цэнаў у краіне і новыя чаканьні атрыманьня 1,5 млрд даляраў расейскага крэдыту, а таксама чуткі пра магчымы працоўны візыт Пуціна ў Беларусь да канца бягучага году.

---

## АФІЦЫЙНА

### Трэці камітэт ААН прыняў рэзалюцыю аб правах чалавека ў Беларусі

**Дакумэнт унесьлі на разгляд ЗША разам з Аўстраліяй, Эўразьвязам, Ізраілем, Канадай, Швайцарыяй і Японіяй. За прыняцьцё рэзалюцыі галасавала 68 дзяржаў, супраць 32, а 76 устрымалася ад галасаваньня.**

У дакумэнце выказваецца занепакоенасьць у сувязі з сыстэматычным парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі й далейшай “эрозіяй дэмакратычнага працэсу”.Улады перасьледуюць апазыцыю й праваабаронцаў, а таксама незалежных журналістаў.

У рэзалюцыі заклікаюць, каб улады Беларусі вызвалілі неадкладна ўсіх палітычных вязьняў, а таксама спынілі перасьлед палітычных апанэнтаў, грамадзкіх актывістаў, праваабаронцаў і незалежных СМІ.

Апроч гэтага, ААН заклікае адсунуць ад пасады ўсіх афіцыйных асобаў, якія маюць дачыненьне да зьнікненьняў палітыкаў, катаваньняў і казьняў, правесьці адкрытае сьледзтва па справах гвалтоўных зьнікненьняў і прыцягнуць да адказнасьці віноўных.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Кангрэс праэўрапейскіх сілаў Беларусі

**Лідэр Народнай грамады (БСДП) Мікалай Статкевіч заклікае правесьці Кангрэс праэўрапейскіх сілаў Беларусі.**

Палітык зазначае, што прыйшоў час вызначыцца, у які бок павінна ісьці Беларусь – у бок Захаду ці бок Расеі. Гэтае пытаньне стала надзвычай актуальным, паколькі з боку шматлікіх эўрапейскіх палітыкаў гучаць канкрэтныя прапановы супрацы як з афіцыйнымі ўладамі, так і апазыцыйнымі сіламі. На думку Мікалая Статкевіча, значная частка апазыцыі надалей ігнаруе заклікі Эўразьвязу.

Лідэр Народнай грамады падкрэсьлівае, што Кангрэс праэўрапейскіх сілаў павінен адбыцца да вясны 2008 году.

Улады не дазволілі менчукам узгадваць пра палітвязьня Аляксандра Казуліна

Менгарвыканкам не дазволіў правесьці пікеты ў дзень нараджэньня экс-кандыдата ў прэзыдэнты, лідэра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандра Казуліна.

Акцыі плянавалася правесьці 25 лістапада ў трох месцах – на плошчы Бангалёр, парку імя 50-годзьдзя Кастрычніка й на вуліцы Арлоўскай.Улады адмовілі даць дазвол на пікеты.

## ГРАМАДЗТВА

### Угодкі Слуцкага збройнага чыну

**27 лістапада беларускае грамадзтва ўзгадвае Слуцкі збройны чын. У лістападзе й сьнежні 1920 году ў раёне Слуцку адбылася спроба ўзброенай абароны незалежнасьці Беларусі. Беларускія вайсковыя аддзелы, у склад якіх уваходзілі сяляне, аказвалі супраціў савецкаму войску.**

У 1918-20 гадах Слуцак быў важным цэнтрам нацыянальнага руху.

У выніку Рыскай дамовы былі вызначаныя новыя дзяржаўныя межы, і Беларусь і Украіна былі падзеленыя на дзьве часткі. Тэрыторыя вакол Слуцку на нейкі час засталася нэйтральнаю. З часам яна апынулася пад панаваньнем палякаў, якія не перашкаджалі разьвіцьцю нацыянальнага руху на Случчыне й стварэньню беларускіх вайсковых аддзелаў. 27 лістапада пачалася барацьба паміж беларускімі й савецкімі палкамі. Сілы, аднак, былі няроўнымі. Пад канец сьнежня слуцкія паўстанцы адступілі на тэрыторыю Польшчы, дзе й былі раззброеныя.

Афіцыйныя ўлады Беларусі гістарычную дату Слуцкага ўзброенага чыну ігнаруюць. Для нацыянальнага руху Беларусі гэта Дзень герояў.

### Каля Барысава перазахавалі 223 французкія жаўнеры

**223 французкія жаўнеры былі пахаваныя каля вёскі Студзёнка Барысаўскага раёну, на левым беразе Бярэзіны. Цырымонію прымеркавалі да 195-годзьдзя пераправы французкай арміі праз гэтую раку.**

Забітыя жаўнеры былі знойдзеныя 2 гады таму ў Вялейскім раёне каля вёскі Селішча. Было высьветлена, што ўсе яны былі альбо забітыя ў баях, альбо проста акалелі ў сьне, ня вытрымаўшы беларускіх

маразоў. Пошукавы баталён каля парэшткаў жаўнераў знайшоў часткі адзеньня, гузікі, гарматныя ядры розных калібраў.

Летась каля Студзёнкі ўжо былі ўрачыста пахаваныя парэшткі аднаго жаўнера. Але француская амбасада пажадала, каб усе ваяры спачылі тут. Пры пахаваньні прысутнічала амбасадарка Францыі Мірэй Мюсо, прадстаўнікі МЗС Францыі, Міністэрства абароны Беларусі, мясцовыя ўлады, сьвятары, кіраўнікі дыпмісіяў некаторых дзяржаваў, прадстаўнікі грамадзкасьці.

Мірэй Мюсо выступіла з прамовай, дзе выказала задаволенасьць, што французкія жаўнеры нарэшце знайшлі вечны спакой, а таксама ўсклала кветкі да помніку бітве пад Студзёнкай, які быў усталяваны 5 гадоў таму.

## ПАЛІТЫКА

### Візыт Аляксандра Мілінкевіча ў Рыгу

**Аляксандар Мілінкевіч знаходзіўся зь візытам у сталіцы Латвіі Рызе, дзе браў удзел у міжнароднай канфэрэнцыі “Балтыйскія краіны й суседзкая палітыка Эўразьвязу”.**

Сустрэча адбывалася пры падтрымцы МЗС Латвіі й Балтыйскай асамблеі.

Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся зь беларускай дыяспарай у Латвіі.

Лідэр Руху “За Свабоду” знаходзіўся ў Рызе па асабістым запрашэньні прэм’ер-міністра Латвіі. У сустрэчы браў удзел і прадстаўнік МЗС Беларусі.

## ЭКАНОМІКА

### Рост коштаў на малако й мяса

**Адбылося чарговае павышэньне коштаў на малочныя й мясныя прадукты ў Беларусі.**

Паводле афіцыйнай інфармацыі, сьмятана, малако й тварог з малым адсоткам тлушчу падаражэлі на 5,5%. Прадукты з вышэйшым адсоткам тлушчу – ажно амаль на 15%. Павышэньне цэнаў на мяса й мясныя вырабы складае каля 8%.

## КУЛЬТУРА

### Выстава твораў Напалеона Орды ў Менску

**27 лістапада ў Менску адчыняецца выстава твораў Напалеона Орды з нагоды 200-годзьдзя з дня нараджэньня мастака. Рэпрадукцыі малюнкаў прывезеныя з Нацыянальнага музэю ў Варшаве.**

Напалеон Орда зьяўляецца адным з найвыбітнейшых мастакоў Рэчы Паспалітай XIX стагодзьдзя. Ён зьяўляецца аўтарам больш за тысячы акварэляў і малюнкаў, якія прадстаўляюць гістарычныя месцы беларускіх і польскіх земляў. Некаторыя працы Орды зьяўляюцца адзінай дакумэнтальнай крыніцай выгляду сотняў рэзыдэнцыяў і будоваў.

Выставу можна наведаць да 29 сьнежня ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Галоўны арганізатар вэрнісажу – Польскі інстытут у Менску.

Belarus live

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

ERB European Radio for Belarus

polishaid

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

Polonia POLSKIE RADIO